БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Радакцыі Ново-Серпухуская 29
Адміністрацыі Захароуская
«Юбілейны Дом».

цыя адчынена ад 1 да 2 гадз
пасьля поудня.
істрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

цыя пак'дае за сабой права па-
яць перасыланые рукапісы і ко-
рэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.,

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб.
на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

33. Менск. Субота 6 ліпня 1918 г. Год I

Менск 6/VII.

Дзержауная будова Грамадзянства у агуле есьць злучэнне перакрыжованных салідарнасьцей.

Бастіа «Гармонія».

хаосу зробленнаго вайной валюцыяй ні адразу вы-
талізовываецца дзержава і
каунасьць.
я іх перша-пачатковай ар-
ацыі трэба собраць усе
ыя, творчыя грамадзянскі-
кауныя элементы.
амыя вострыя запытанні
соцыяльныя, глаунае зя-
пеа. У 1906 г. у Гасударсць-
ой Думе па зямельнай спра-
апісалася чуць ні 300
ароу. Ужо 12 гадоу аб
і гаворуць усе партыі.
од фактычна у часе рэва-
ыі брау зямлю у рукі.
ле слабасьць аграрных усіх
гый гэта тое, што яны ні
цца з эканамічным раз-
цем і эвалюцыей. Гэта ахі-
ва пята. Уся эвалюцыя у
вычэрпываецца трудовым
упіцельным перадзелам. Але
намічныя жалезныя законы
ятуць усю гэту адсебяціну
з колькі год.
Эуропа развязываець зямель-
справу у крупным ма-
габе. Хто знаем з аграрны
рэформамі Гэрманіі, Фран-
, Англіі таму будзе зразу-
а, што аграрная рэформа
язапа з развіццем і экана-
ным уроунем усяго гасу-
ства. На яе трэба дзесяткі
оу. Апрыч зямлі есьць міль-
і другіх спрау, без каторых
ля ні зрушыцца з мейсца.
Беларусі трэба законна-
рчая праца, каб зрабіць
ржауна-краевы мэханізм. Для
аго патрэбны людзі інтэлі-
цыі, тутэйшыя, знаемыя з
унками нашаго жыцця.
Трэба у Радзе зрабіць прэд-
уніцтво усіх арганізаваных
уп нашаго краю. Такой да-
гай злажылася і рада пер-
й сэссіі. Толькі трэба яе
асканаліць. Першая стадзія
га арганізацыя саміх груп,
я выбора сваіх адпаведзяль-
іх прэдстаунікоу. Схема мо-
быць такая:

1) уласнасьць і капітал: се-
не, сярэднія зямельныя улась-
кі, вялікія зямельныя уласьнікі, фабрыканты і заводчыкі, банкі, купцы.

2) коммуны: воласьці, земствы, месты, мястэчкі.

3) рэлігіозныя союзы: духоунікі праваслауныя, каталіцкія, еурэйскія, староверы, кальвіны, лютэране, мусульмане і др.

4) нацыянальныя союзы: беларусы, палякі, вялікарусы, усерусы, еурэі, літвіны, латышы, немцы.

5) рабочыя: сельска-гаспадарскія парабкі і служачыя, дамовая прыслуга, рабочыя заводау, фабрык і др. ветак працы, чыноунікі дзержауных і грамадзкіх арганізацый

6) інтэлігэнтныя профэсіі. адвокаты і магістратура, дактары, інжэнэры, агрономы, земляустроіцелі, майстры пекнаго штукарства, журналісты, літэратары, вучыцелі ніж школ, вучыцелі сярэдніх школ, унівэрсітэта.

7) Экономічныя союзы: коопэратары, сельск.-гаспадарск. таварыствы, тарговыя союзы, фабрычныя.

Вось агульная схема прэдстауніцтва адпаведных груп Беларусі. Гэта прэдстауніцтво і усяго краю, усіх жывых творчых сіл і інтэрэсоу усіх клясоу. І гэта адпаведаець нашым традыцыям.

А. У.

Агульныя весткі.

ПАРЫЖ, 1/VII. Афіцыяльна паведамляецца: У ночы а 12 гадзіне 48 мінут была паднята трывога, дзеля таго, што рэшта нямецкіх самалётаў прабавала прыблізіцца да парыжскіх вобласьцей. Нашымі артылерыйскімі пастамі быў адкрыты агонь. Усе сілы абароны былі у дзелі. Трывога закончылася а 2 гадзіне 20 мінут ночы. Бомбы упалі замежамі абароннай сфэры.

ЖЭНЭВА. У Цэтцы згарэў, пасьля сільнаго ўзрыву, уладзены дзеля ваенных патрэбнасьцей рафінадны завод. Страты вялікія. Усяго трох забітых і некалькі раненых.

БОГОТА. Прэзыдэнтам рэспублікі Колумбіі выбраны быўшы міністр міжнародных спраў, Марко Суарэц.

КОПЭНГАГА. У Рэйкявіцы пачаліся перагаворы аб адносінах Ісляндзіі да Даніі. Газэта «Бэрлінске Тыдэндэ» адмечае, што гэта тычыцца Англіі, Ісляндзія вымагае прызнання яе як самоістную дзержаву.

Весновыя здабыча Гэрманіі у Расіі. Гэрманскае вайсковае бюро прэсы даець спіс багацця узятаго з 18 лютаго да 2 сакавіка пры паходзе у Расію: 4 штаба армій, 5 корпусных штабаў, 17 дывізіонных, многа палкавых.

4,818 ахвіцэроу, 77.342 салдат, 4,381 гармата, 2.867.500 снарадоу, 1.263 мінамётаў, 9,490 пулемётаў, 751.972 фузьі, 102.250,900 патронаў, 2100 локаматіваў, 25.650 вагонов, 63.102 павозкі (13.650 каней), 1278 аўтомобілей, 22 броневіка, 27 танкоў, 28 вагоноўварштатоў, і 1.705 палёвых кухань, 152 аэроплянa, 1 броніровaны поезд, 1 поезд з герматамі, 5 поездоў—лазарэтоў.

Калі зірнуць у глаўны склад здабычы, то можна відзець скрозь сьляды безгалоўя пры адступленні.

У Пскове, так сама навалено усякаго дабра: 5000 вагонаў дубэльтовай нагрузкі коштам каля поўміліарда марак папала гэрманцам у рукі, 13.000 вагонаў амуніцыі коштам 200 мілліоноў марак, гранаты розных калібраў запакованыя у скрынкі з ангельскімі і расійскімі падпісамі, толькі што прысланныя новыя 254 гарматы, 4 новыя японскія гаубіцы, 300 кулямётаў. На складзе адзежы—2-х паверхных магазынах—навалена да страхі. На кожнай штабелі надпісы: 223000 шт. бялізны, 96000 шт. зімовай бялізны і др. рэчэй па 5 мілльёнаў марак; склад аптэчны і доктарскіх інструмэнтаў па 10 мільёнаў марак, бялізна і адзежа для сесьцер. Войсковыя матэр'ялы, павозкі і др. на 8 мільёнаў марак. Медзь, олова, шкура, масло, тлустасьць па 8 мільёнаў марак; аўтомобільный парк с 70000 літрамі бензіна, 22500 літр. газы і т. д.

«Voss. Z.»

ГААГА 1 гм. Японскі пасол у Лёндане атрымаў достоенство доктора honuris Kausa у Шоффільдскім унівэрсытэці. У сваёй прамове ён гаварыў аб сэрдэчных стасунках паміж Англіяй і Японіяй, каторыя давялі да супольнаго змагання проці ваеннай сілы Нямеччыны. Гэтая згода азначае для Японіі канец яе ізоляцыі.

СОФІЯ 2 гм. Новы міністр фінансаў Ліпачэв высказаўся аб цэлях балгарскаго ураду: Палітыка Болгарыі астаецца нізьменнай. Дэмократычны габінэт будзеісьці да злучэння без компэнсацыяў усіх Балгараў у аднэй нізалежнай айчыне, пашыранай у сваіх граніцах з Македоніяй сэрбскай і грэчаскай, Мораваю, Добруджай і Працэяй.

БЭРЛІН 2 гм. Агульны зьвязак нямецкіх артыстаў улажыў і падаў мэморыю, аб звароце скарбаў мастацтва, якія у працягу апошніх 150 гадоў прымусова выйшлі с-пад нямецкаго ўладання. У мэморыі просіцца, каб пры будучых мірных перагаворах абстаіваліся інтэрэсы нямецкіх артыстаў у непрыяцельскіх старонах.

Канцелярскі урад адказаў на гэта, што зачэпляныя пытанні ужо разглядаюцца у спэцыяльных камісіях, куды будзе перадана і гэта мэморыя.

Весткі з Расіі.

БАЗЭЛЬ, 2/VII. Згодна швейцарскім газэтам, у Расіі зноу уведзена сьмертная кара. Маскоўскім рэвалюцыйным трыбуналам прыгавораны да сьмертнай кары і растрэляны два браты, вядомыя панславісты, Чэрэп.

ЦУРЫХ, 2/VII. Згодна «Нэйер Цурыхэр Цэйтунг», новы прыказ большэвікоў пагражае карай сьмерці усім, хто займаецца спэкуляцыяй цэнных папер.

АМСТЭРДАМ, 2/VII. Як паведамляе «Дэйлі Экспрэс», сямейство Романавых перасэлено у маленькае места Копельміш, Вятскай губэрні. Ці ёсьць між імі і сам Мікалай II—пакуль ішчэ німа ведама.

ПЕЦЯРБУРГ 2/VII. Згодна «Новому Вѣстнику», на прыехаўшаго у Омск на ваенную параду з генэралам Алексеевым і другімі контр-рэвалюцыйнымі кіраўнікамі, кіраўніка чэхо-словацкіх войск Рожычка, было вроблено нападзенне. У мамэнт звароту Рожычка с парады, быўшай у ратушы, адной нівядомай асобай у яго было зроблено некалькі выстрэлаў з рэвальвэра. Адна с куль папала у плуц. Нападаўшаму удалася уцячы.

ШТОКГОЛЬМ, 2/VII. Пры перэвыбарах пецярбургскаго савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў у час выборнай агітацыі забіты кандыдат—меньшэвік Васільеў.

ШТОКГОЛЬМ, 2/VI. Разам са сваімі спутнікамі німа ведама дзе счэз швэдскі пасол у Токіо, Валленбэрг, каторы пасьля канфлікта у Владывастоку з дыплёматамі дзержаў Згоды меў на мэці прабрацца праз Сыбір у Пецярбург. Усе шуканні швэдскаго пасольства у Пецярбурзі асталіся без рэзультату.

З Украіны.

— **Кіеу 30 VI.** Нямецкі пасол ф. Мумм перадау гэтману ліст з выказам спочуцця.

Ясьнейшы Пане Гэтмане! Па найвыжшаму загаду майго найміласьцівейшаго Пана, Імпэратара нямецкаго, маю гонар выказаць Вам, пане гэтмане, і усяму украінскаму народу найглыбейшае спочуцце Яго Імпэратарскай Вялікасьці с прычыны вялікаго выбуху, каторы збурыу часьць Кіева і павеу за сабой такія вялікія ахвяры срод Кіева.

Адказуючы, гэтман выразіу ад сябе і украінскаго народу глыбокую падзяку за спочуцце Я. І. В. і разам злажыу паслу сэрдэчную падзяку за

нізменную жыцьлівасьць аказываную ува усєлякіх здарэннях перажываных Украінай.

Харчы і этыка.

Нам вядома ішчэ з біблійнай гісторыі, што кожная вайна прыносіць с сабою голад. Гэта зусім звычайнае зьявішчо: прыастанаўліваецца работа па полі, вайскамі нішчуцца і палюцца харчавыя і іншыя запасы пры адступленні і г. д.

Гэтак было калісьці, гэтак сама рабілася у часе сучаснай вайны. Культура цяперашняго часу стварыла толькі тую рожніцу у хлебнай справе, што ежа дзеліцца, нормуецца паміж пасяленнем і гэтым шмат выйгрывае, а ні былоб гэтаго нормавання, дык даўно бы дзесяткамі тысяч людзі памiралі бы з голаду.

С самаго пачатку вайны, калі Гэрманія першая уладзіла хлебную дзержаўную манаполію і пачала выдаваць насяленню хлеб па бонам—яе працiўнікі выкпівалі з гэтагоі радаваліся таму, што вось «у Гэрманіі ужо німа харчоў, а хутка мы зморым яе голадам».

Проста людзі ні зразумелі гэтай разумнай ва усіх адносінах пастановы ні прэдвідзючы вялікай карысьці гэтай «нямецкай акуратнасьці». У Расіі агледзіліся ужо позна і увялі бонавую сыстэму на хлеб, калі гаспадарская разруха высунула на відочнае публічнае мейсцо вострыя клыкі Цара Голада. А была-б ад самаго пачатку вайны уведзена бонавая сыстэма на харчы, то цяпер соткі тысяч рабочых і розныя другіх станаў людзей ні галадалі бы.

Наагул, недахват прадуктаў адчувае цяпер бадай ўвесь сьвет. Нават у нівaюючых странах, с прычын дастаўлення гэтых прадуктаў тым ваюючым народам, каторым яны так ці іначай сімпатызуюць,—чуецца скупасьць прадуктаў і з імі абходзюцца досіць ашчадна.

Цэны на прадукты усюды падняты, павялічаны у нокалькі сот працэнтаў, Зусім зразумело, што людзі ад гэтай прозаічнай рэчы, як недахват хлеба, пачалі «нэрвавацъ», зьмяльчэлі, здрабнелі характэрам. Зьявілося ім такая забота, аб якой яны ніколі ніякаго паняцця ні мелі—як быць сытым і адзетым? Гэта зрабілася міравым пытаннем большасьці людзей розных станаў. розных ккясаў, ні гледзючы нават на грашавыя іх здабыткі.'

Да крайняго рубежа свайго людзі у гэтым кірунку дайшлі у большэвізіі, дзе нравы людзкія упалі, папізіліся да казачнасьці. Там Цар Голад перэрабіў людзей на свае цацкі-забавы, там цяцер што называецца на людзях парасьлі быдляныя і зьвярыныя скуры. Страшныя массавыя убіўствы і грабяжы, нітасуючыя занявці людзей відаць на кожным кроку. Палкоўнік заметае вуліцу, інтэлігэнтная дама--газэтчыца, юрыст — насільшчык і г. д. бо есьці хочэцца кожнаму. С памойных ямпадбіраюць розныя адбросы, ліжуць клей з афішаў, харчуюцца шалупінамі ад картопляў, словам, усяго ні пералічыш да чаго людзі прымусова дайшлі. Безспрэчна, што гэта усё мае свой вялікі уплыў на псіхіку людзей, людзі палі духам,—пала этыка людзая.

Што тычыцца сталых людзей, то у гэтым апасьлівасьці вялікай ні можа быць, пасьля таго як па аканчанні вайны жыццё верніцца у сваё русло, яны болей меней увайдуць у ранейшы духоўны настрой, але наконта маладога пакалення і дзяцей, то тутака ёсьць чаго апасацца. З іх васпрыімчывых душ цяперачына ні так лёгка вытіхнецца. Выхаванне, якое адтрымлівае дзіця, па фізычным законам прыроды, астаецца на ўсё жыццё... А дзеці, молядзь —гэта будучае, прыемнікі сучаснаго пакалення—аб іх павінна быць і першая забота аб іх трэба дбаць болей ўсяго. Аб гэтым цяпер трэба задумывацца кожнаму народу наагул, а нам, беларусам, у асобнасьці. У нас бежанскія хвалі ішчэ і цяпер ні вярнуліся усе на свае родныя папялішчы, нашымі дзяцьмі перапоўнены усе прытулкі, дзе нельга казаць, каб яны карміліся дасыта.

Трэба зараз жа нам пачаць дбаць аб тым, каб пашэ будучае пакаленне усё-ж такі выйшло з гэтаго усесьветнаго кашмару, па мажлівасьці цэлым і фізычна і духоўна.

Я—р.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Да прыезду р.-к. епіскапа. Консэнкрацыя у Варшаве зноу назначанаго на менскую катэдру р.-к. епіскапа Лозінскаго ні адбылася, с прычыны ніатрымання з Рыма папскай буллы, каторай чакаюць гэтымі днямі.

Ездзіушая у Варшаву ад мейсцовых католікау дэлегацыя, у складзе кс. Маеускаго і Русецкаго, вярнуліся.

У харчэунях, чайных, заезжых домах і інш. пачауся строгі санітарны агляд. Некаторым з гаспадароу аб'яулены для першаго разу прэдасьцярогі прывесьці усе у чысты від.

Хлебны паек на будучым тыдні павялічываецца ад 2½ ф. на тыдзень да 3 ф. на порцыю.

Па Ліб.-Ром. ж. д. у сталоуцы для служачых і рабочых ст. Менск за апошні час такія мізэрныя абеды, што часьць сталоунікоу зноу рэшыло скардзіцца у харчавую часьць упраулення.

К далучэнню уніятау. Ушанаванне памяці далучэння уніятау с праваслаунай царкваю, звычайна адбываушаеся у першы чацьвер пасьля троіцкаго тыдня, 4-го ліпня па загаду епіскапа Гэоргія адменяно.

Увоз у место харчоу, на аснові вядомаго прыказу нямецкіх уласьцей а прыастаноуцы кантроля над увозімымі прадуктамі, ужо пачауся.

Гэта прымечаецца, глауным чынам, па Троіцкім рынку.

У губэрнскім прысуцтві у хуткім часе мае быць адчынены сэрвітутна—чыншавы аддзел.

У І-м пазычкова-зьберэгацельным таварыстве гадавы агульны сход членау пры якім бы то ні было ліку сабрaушыхся (3-і раз), адбудзецца 14-го ліпня.

Одпуск хлеба ад 8 па 14 ліпня, па апавешчэнню меськай харчовай камісіі, будзе адпускацца ні па лістах «ржаной хлѣбъ», а па запасным бонавым лісткам.

Бібліографія.

A. Łuckiewicz i J. Stankiewicz. BIEŁARUSKI PRAWAPIS. Wydańne Biełaruskaha Kamitetu. Wilnia. Druk. M. Kuchty. 1918. Cana 50 fen.

(А. Луцкевіч і Я. Станкевіч. БЕЛАРУСКІ ПРАВАПІС. Выданне Бел. Кам. Друк. М. Кухты, 1918 г.)

Праца А. Луцкевіча і Я. Станкевіча уяуляе сябе пробку даць пачатковы падручнік для школы пры навуцэ пісання. У сваіх засадах яна палегае на другой працы першаго з аутарау — А. Луцкевіча — «Як правільна пісаць па беларуску».

Спосаб, якім уложэна кніжачка, якую часьць грамматыкі захоплівае і сыстэма цьвічэнняу, напамінае вам популярны нейкі час у многіх вучэбных округах былой імпэрыі падручнік Некрасова для пачатковых школау і сьведчыць аб поунай прыгоднасьці яе для ужывання у першай клясе пачатковай школы. Цікава было-б убачыць прадаужэнне гэтай працы аутарамі, якое абхоплівало-б увес курс беларускай грамматыкі.

Гэта—з боку мэтоды. Трудна ацэніваць вартасьць кніжкі з боку навукі. З гэтаго боку мы маем шмат суроваго матэр'ялу сабранаго і па часьці сыстэматызаванаго беларускімі філогогамі, які патрабуе крытычнаго разгляду і апрацавання. Тыя законы, акія устанауляюцца аутарамі у «Беларускім правапісе» трэба уважаць за пробу такога крытычнаго апрацавання, пробу, якая, падобна іншым пробам у тым-жа кірунку, сама патрабуе далейшай крытыкі. Але прыватная крытыка, хаця і дапусьціма у данным выпадку, нічога ні зробіць. Крытыка падобных працау, як роуна-ж і крытычнае апрацаванне усяго суроваго філологічнаго матэр'ялу, павінна быць дзелам навуковай коллегіі, поустауннe якой—патрэба бліжэйшага часу. Ей жа належыць астатэчна пастанавіць аб знаках у беларускім пісьме—кірыліцэ ці лаціңцэ, бо ужыванне тых і другіх цягне за сабой нікарыстны для нацыі расход духоунай энэргіі і падтрымоувае дзяленне на каталіцкую і праваслауную «палаціны», чым карыстаюцца дэмагогічныя агенты польскаго і вялікарускаго імпэрыялізмау.

В.

АБ ТРУСОХ.

Напісаў В. Грынеўскі. Выданне Беларускаго Камітэту. Др. М. Кухты 1918 г. Цана 30 фэн.

Кніжка В. Грыневіча (адбітка з Гомана) уключае у сабе сьціклае апісанне трусовых народаў, спосабаў гадоўлі, кармлення і хвароб трусоў, і можа быць цікавай для усякаго, хто займаецца трусаводствам.

К.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 4 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

У вечары на некаторых вучастках ажыўлялася баева[я] дзеяльнасьць. З раніцы сільны варожы агонь па абодзьвы[х] бакох Соммы. Тут развіліся пяхотныя баі.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Пауночней рэкі Эн сільныя францускія атакі. У нашы[х] перэдавых ліпіях усходней Мулэн—Су—Туван вораг бы[ў] адбіты контр-атакай. У рэшта яго атакі былі адбіты пера[д] нашымі загражденнямі. Узабноўленныя націскі працiўнік[а] захадней Шато—Тьерры кончыліся для яго піўдачай.

Група арм. Гальвіца і Герцога Альбрэхта.

Сільны варожы націск па усходнім беразі рэкі Маа[с] быў адбіты. Каля Зундгаў мы ўзялі пры удачным прэдпры[е]імстві палонных.

Лейтэнант Удэт меў сваю 40, лейтэнант Румей сваі 2[9] і 30 перамогі у паветры.

Першы Гепэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

КАЗКА.

Дайце, я вам расскажу казачку па Мультатулі аб «социялістах» у Расіі:

Жылі—былі яны пад самадзержавіем — пад Мікалаем, акружаным рознымі Распуцінамі і міністрамі—зладзеямі і здрайцамі народу.

І вось,—зрабіўся переварот. Кадэты хацелі толькі зьмяніць Мікалая на яго брата Міхаіла, але і гэтаго мала: народ ні захацеў,

Злажыўся склад міністраўсоцыялістаў, хвалеваўся—вахтаваўся габінэт пакуль Керанскі яго згартаваў. Пайшлі мітынгі, сходы, зьезды, рэвалюцыйныя гарачкі па усей Расіі, выпусьцілі с турмаў і ссылкі усіх палітычцых [а з імі і угалоўных]. Утварылася вясновае свято усіх народаў Расіі, на першым пляне стаяла Воля Народу. Людзі у першых мядовых месяцах рэвалюцыі жылі пад хмелям свабоды, чакаючы усё Устаноўчаго Сойму, на каторы[м] выбраннікі усіх народаў Расі[і] павінны былі згрунтаваць на[] родную волю, народнае жыцц[е] на доўгія годы.

Але і гэтаго мала:

Зараз жа ні чэкаючы кан[] ца вайны, зараз жа дай і[] талерачку нябесную, ніадклад[] на. дай ім аўтаноміі, фэдэра[] цыі нізалежнасьці народаў!

Але і гэтаго мала:

Дайце нам поўнаго соцыялізму па Марксу і інш.

Трэба зараз жа зьнішчы[ць] буржуазію, зьнішчыць увес[ь] стары лад жыцця і рабіць ус[ё] па Бэллямі!

І «таварыны», — левыя [і] левых, пачалі «працаваць»—рабіць сацыялізацыю поўную[] праўдзівую ва усім.

Захапілі уласьць, уладзіл[і] «дыктатуру пролетарыяту[»] і пайшлі гуляць; соцыялізацыя рэлігіяў, соцыялізацы[я] якой бы сабе ні было улась[] пасьці,—соцыялізацыя ўсяго,

І гэтаго мала. Уласьць вель[] мі ап'яніла большэвікоў і [у] гэтым кірунку яны дайшлі да[] лей быўшых самадзержаўца[ў] —шпігоўство, закрыцці часо[] пісей анты-большэвіцкіх, арэш[] ты лепшых людзей, вучоных[] пісьменнікаў, маляроў і г. д[.] поркі рабочых розгамі, ра[з] стрэлы селян за хлеб, дзікія[] зьдзекі над напаўшымі у і[х] лапы партыйных працоўнікаў[.] Але і гэтаго мала: большэвіцкія міністры самымі простымі зладзеямі парабіліся[,] уцекаюць з кучамі грошай, чырвонаармейцы простымі разбойнікамі рабоўнікамі сталі — і ўвесь народ стогне.

Адарваліся ад Вялікаросіі[,] як ад пошэсьці Украіна, Дэн, Беларусь, Фінляндзія, Каўказ, Крым, Сыбір і г. д.

Цяпер там латышскія стрэлкі ваюють с чэхо-словакамі.

Сам народ ўжо праклінае «волю народа» і марыць аб старых-старых спакойных часах...

«Было бы вельмі сьмешна, каб ні было-б так сумна...

З. Б.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.